# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

27 снежня 2019 г. № 51 (536)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


ТЭМА ТЫДНЯ










Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# БЕЛАЗ, КІНАТУРЫЗМ І ЧАРНОБЫЛЬСКАЯ ЗОНА

## У Беларусі з'яўляюцца новыя месцы, якія прываблiваюць турыстаў

**За 11 сёлетніх месяцаў у нашу краіну праз міжнародныя пункты пропуску ўехала больш за 4,5 мільёна іншаземцаў. Чакаецца, што па выніках года гэтая лічба наблізіцца да пяцімільённай мяжы. Традыцыйна найбольш папулярнымі з'яўляюцца наземныя віды транспарту: так, аўтамабільным транспартам у Беларусь уехала амаль 3,2 мільёна іншаземцаў, чыгуначным — 611 тысяч, авіятранспартам у краіну прыбыла больш за 660 тысяч. Самымі папулярнымі месцамі ў нашай краіне з'яўляюцца чатыры аб'екты, унесеныя ў спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Сярод іх жамчужыны беларускай архітэктуры — Мірскі і Нясвіжскі замкі, а таксама Белавежская пушча і элементы геадэзічнай дугі Струвэ. Беларускіх аб'ектаў, якімі цікавяцца турысты, становіцца з кожным годам усё больш, таму з'яўляюцца новыя віды турызму. Пра гэтыя новыя віды, праблемныя пытанні ў сферы і перспектывы мы пагаварылі з намеснікам дырэктара Дэпартамента па турызме Віталём ГРЫЦЭВІЧАМ.**

стар. 4, 13

ЧЫСТАЯ ВАДА

# БЕЗ ЖАЛЕЗА І ІНШЫХ ПРЫМЕСЯЎ

## Калі ў сельскай мясцовасці вырашацца праблемы з пітной вадой?

**Да 2025 года ў сельскай мясцовасці плануецца пабудаваць 1400 станцый абезжалезвання вады. У іх маюць патрэбу невялікія населеныя пункты, дзе жыве ад 200 да 500 чалавек. Гэта дазволіць забяспечыць усё насельніцтва краіны якасная пітной вадой.**

### Будаваць па 250 станцый у год

Яшчэ летась аблвыканкамы сумесна з Міністэрствам жыллёва-камунальнай гаспадаркі ацанілі сістэмы водазабеспячэння па ўсёй краіне.

— Вызначана 1400 населеных пунктаў, дзе будуць будавацца станцыі абезжалезвання. Яшчэ 300 плануецца забяспечыць водазаборнымі свідравінамі, а 180 — пераpадключыць да населеных пунктаў з якаснай пітной вадой, — адзначае **кансультант аддзела вадаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі і добраўпарадкавання ўпраўлення камунальнай гаспадаркі і энергетыкі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Ірына САЛІВОНЧЫК.**

У 2019 годзе вялося будаўніцтва 250 станцый абезжалезвання. На гэта выдаткаваны сродкі рэспубліканскага і абласных бюджэтаў.

стар. 16

ЗВЯЗДА


## СЁННЯ Ў НУМАРЫ

### Нашы дзеці



Як праходзіць аднайменная рэспубліканская дабрачынная акцыя ў краіне. стар. 3

### У Клімавічы ці на Мальдывы?



У райцэнтры распрацоўваюць унікальны прыродны маршрут, які прывабіць шматлікіх гасцей. стар. 4

### Навацыі ў турындустрыі



Праект абноўленага закона «Аб турызме» плануецца ўнесці на разгляд у парламент у 2020 годзе. стар. 13

### Новы імпульс «бязвізу»



Бязвізавая зона пашыраецца, але ёсць праблемы, лічаць эксперты. стар. 13

### Палац і заасад



Рэзерваў для развіцця турызму на Ружаншчыне, што ў Брэсцкай вобласці, яшчэ шмат. стар. 14